ДУА «МІНСКІ АБЛАСНЫ ІНСТЫТУТ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ»

ЦЭНТР МЕДЫЯРЭСУРСАЎ І БІБЛІЯТЭЧНАЙ РАБОТЫ

# АДУКАЦЫЯ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

## Ў РЭСПУБЛІКАНСКІХ І АБЛАСНЫХ СМІ

СБ Советская Белоруссия беларусь сегодня

Настаўніцкая газета

Звязда

Рэспубліка

Народная газета

Мінская праўда



КАСТРЫЧНІК

**«Настаўніцкая газета»** – выданне асветнікаў Рэспублікі Беларусь.
Выдаецца з 20 снежня 1945 года. Выходзіць тры разы на тыдзень.
Заснавальнік: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77.
Web-сайт: http://nastgaz.by/
E-mail: info@nastgaz.by

***31.10.25***

**Сахно, Н.** Шлях да прафесийнага росту / Н. Сахно // Настаўницкая газета. – 2025. – 31 кастрычніка (№ 82). – С. 7.

*Артыкул прысвечаны 85 – годдзю з дня заснавання МАІРА, гісторыя якога непарыўна звязана з гісторыяй развіцця сістэмы адукацыі Мінскай вобласці. Гутарка вядзецца з рэктарам МАІРА* ***Фёдарам Драбеняй****. На пытанне, якія асноўныя задачы ставіць кіраўнік перад калектывам Фёдар Валенцінавіч адзначыў, што ў прыярытэце - забяспячэнне сістэмы адукацыі Мінскай вобласці высокакваліфікаванымі кадрамі і рэалізацыя пазнавальных запытаў.*

***28.10.25***

**Сахно, Н.** Навацыі і традыцыі / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 28 кастрычніка (№ 81). – С. 9.

*Артыкул прысвечаны калектыву дзіцячага сада №11 Слуцка, які адрозніваецца творчым падыходам, згуртаванасцю, што спрыяе стварэнню камфортнага і развіццёвага асяроддзя для дзяцей. А таксама аўтар знаёміць з інавацыйнымі праектамі, у якіх прымае удзел сярэдняя школа №12 г. Слуцка. Дырэктар СШ №12* ***Алена Гаўрыловіч*** *звяртае увагу на мэту праекта – укараненне мадэлі фарміравання сацыяльнай кампетэнтнасці навучэнцаў сродкамі фізічнай культуры з улікам асобасных характарыстык і дыферэнцыяцыі адукацыйнага працэсу.*

***24.10.2025***

**Сахно, Н**. Крыжаванка па англійску / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 24 кастрычніка (№ 80). – С.6.

*Артыкул прысвечаны Астрашыцка-Гарадоцкай сярэдняй школе Мінскага раёна, дзе працуе настаўніца англійскай мовы* ***Наталля Гіль****, якая прымяняе на ўроках візуалізацыю вучэбнага матэрыяла. Гэта дапамагае пазнавальнай актыўнасці школьнікаў і спрыяе добраму засваенню зместу ўрока.*

КАСТРЫЧНІК

**Дубоўская, В.** Для дзяцей і разам з імі / В. Дубоўская // Настаўніцкая газета. – 2025. – 24 кастрычніка (№80). – С.1.

*Артыкул прысвечаны ўстановам адукацыі Старых дарог і раёна, дзе працуюць творчыя педагогі. А пераканалася ў гэтым журналістка Выдавецкага дома "Педагагічная прэса". Візіт у Старыя дарогі пачынаўся з размовы з начальнікам ўпраўлення па адукацыі, спорце і турызме Старадарожскага райвыканкама **Вікторыі Пекар**, якая распавядала пра арганізацыю работы ўстаноў адукацыі раёна ў сучасных умовах. "Якасная дзейнасць сістэмы адукацыі залежыць ад умення кіраўніка аб'яднаць людзей, веры у іх магчымасці", - так лічаць кіраўнікі ўстаноў.*

***14.10.2025***

**Сахно, Н**. З улікам традыцый./ Н. Сахно // Настаўнікая газета. – 2025. – 14 кастрычніка (№77). – С. 14.

*Артыкул прысвечаны аддзелу медыярэсурсаў і бібліятэчнай работы Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі, унікальнасць якога ў тым, что ён адзіны ў краіне, хто сумясціў бібліятэчную і метадычную функцыі. А дзякуючы кіраўніку **Алёне Белай**, ён стаў метадычным цэнтрам для школьных бібліятэк вобласці.*

***03.10.2025***

**Вернасць прафесіі** // Настаўніцкая газета. – 2025. – 03 кастрычніка (№74). – С. 7.

*Артыкул прысвечаны сістэме адукацыі Мінскай вобласці. Гутарка з начальнікам галоўнага ўпраўлення па адукацыі аблвыканкама **Мікалаем Башко**.*

**Сахно, Н.** Хто валодае інфармацыяй, той… / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. – 2025. – 03 кастрычніка (№74). – С. 10.

*Свае думкі на кошт папулярнасці "Настаўніцкай газеты" як галоўнай інфармацыйнай крыніцы для педагогаў выказвае дырэктар Лошніцкай гімназіі Барысаўскага раёна **Юлія Саматыга**.*